*А. І. Смолік,*
*прафесар, доктар культуралогіі,*
*загадчык кафедры культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# РЭЛІГІЙНЫ КАНТЭКСТ ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЫ І. К. КАНДРАЦЬЕВА

Рэканструкцыя намі стуктуры мастацкіх, навукова-даведачных, педагагічных тэкстаў Івана Казіміравіча Кандрацьева як пэўнай цэласнасці дазваляе ўспрымаць іх як своеасаблівую культурную прастору, у якой сутыкаюцца розныя дыскурсіўныя інстанцыі, мноства гаворачых і разумеючых «я». Кандрацьеўскаму тэксту ўласцівы шматлікія тэарытычныя тэмы: філасофскія, палітычныя, лінгвістычныя, сацыялагічныя, педагагічныя, гістарычныя і рэлігійныя. Тэксталагічны аналіз літаратурнай спадчыны пісьменніка дазваляе гаварыць аб пантэістычным успрыманні ім свету. Рэлігійны дыскурс выразна выяўляецца ў шматлікіх паэтычных і празаічных творах І. Кандрацьева. Аперцэпцыя свету ў многіх літаратурных персанажаў не толькі міфапаэтычная і язычніцкая, але і хрысціянская. Рэлігійна-сакральны элемент прысутнічае ў мностве твораў І. Кандрацьева даволі прыкметна. На гэта звярнуў увагу К. Чукоўскі, які не падзяляў рэлігійна-філасофскія погляды пісьменніка, але разам з тым аддаваў даніну павагі яго мастацкаму майстэрству. Так, К. Чукоўскі ў сваіх успамінах пісаў, што Кандрацьеў бравіраваў «своей необузданной преданностью белому царю, чудотворным иконам, православным церквям и т. д. » [14, с. 174]. Сапраўды, светапогляд І. Кандрацьева фарміраваўся пад уплывам рускай рэлігійнай філасофіі. Ён прытрымлмваўся ідэй усеадзінства, сафілагічнсасці. У сваіх дыялогах з раскольнікамі Іван Казіміравіч імкнецца пераканаць іх у неабходнасці адзінства рэлігіі і нацыі. Адзінства ім разумеецца як субстанцыя, якая існуе не за кошт усіх альбо стратна для ўсіх, а на карысць усіх. У аповесці «Божы біч» І. Кандрацьеў ідэю ўсеадзінства ўвасабляе праз стварэнне гарманічнай карціны духоўнага яднання Правадыра і яго супляменнікаў, што дазваляла старажытнаму этнасу шматкратна памножаць яго дынамічныя памкненні. Старажытная гісторыя славянскіх народаў уяўляецца творцам як арэна барацьбы касміцыруючых і хаатычных сіл, у якіх чалавек займае пэўную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазіцыю. Аціла, важак гунаў, падаецца як Боская кара народам раз'яднаным, якія не маюць адзнага Бога, ідэі.

У сваіх рознажанравых творах пісьменнік пераконвае чытача ў тым, што праваслаўная спадчына валодае велізарным патэнцыялам духоўна-маральнага выхаваня асобы, так як умацоўвае душэўныя сілы чалавека і здольна супрацьстаяць злу, дазваляе вызначыць каштоўнасныя жыццёвыя арыенціры. Ужо ў раннім сваім вершы віленскага перыяда (1868 г.) «Пречистенская церковь» паэт перадае своеасаблівасць светаадчування і светаразумення праваслаўнага чалавека сродкамі малітвы: «И как молитва там отрадна! / И ей предела в сердце нет! / И так внимает ухо жадно, / Что не внимало столько лет!.. / Но сердце наше не забудет / И тех, кто всем руководил: / Их каждый долго помнить будет, / Их имя каждый затвердил» [2, с. 2]. У паэзіі маскоўскага перыяда (1872–1904) ідэя яднання царквы, улады і народа выяўляецца больш выразна: «Слава богу, храмам божиим, / Слава всем святым местам, / Слава нашим православным / Позолоченным крестам. / И еще на годы долгие / В ночь и ясную зарю / Слава белому могучему / Православному царю» [1, с. 173]. У 80–90-х гадах XIX ст., калі адбываўся адыход ад вышэйшых духоўных інтарэсаў і цэласнай духоўнай культуры, І. Кандрацьеў разам з М. В. Успенскім уключаецца ў палеміку з Л. М. Талстым, А. М. Някрасавым, Г.І. Успенскім і іншымі прадстаўнікамі мастацтва, якія пераходзілі на пазіцыі атэізму. К. Чукоўскі пісаў, што па ініцыятыве Кандрацьева Г. І. Успенскі апублікаваў серыю выкрывальных накідаў – аб А. Някрасаве, Льве Талстым, Глебе Успенскім [14, с. 174].

Такім чынам, творца быў перакананы, што праваслаўная царква павінна стаць мовай, якая аб'ядноўвае ўсе славянскія народы.

Сутнасць праваслаўнай веры, значэнне малітвы, хрысціянскіх каштоўнасцей вельмі глыбока раскрыты ў літаратуры для дзяцей. Прыкладам такога педагагічнага твора з'яўляецца чытанка для дзяцей «Іскра Божая». Аналіз яе зместу сведчыць: яна складаецца з цікавых мастацкіх тэкстаў, каб выклікаць у маленькіх чытачоў ахвоту да іх чытання. Творы, якія прапаноўваліся для чытання, закраналі ў дзяцей лепшыя струны іх душы, развівалі спагаднасць, гатоўнасць стаяць за грамадзянскія ідэалы, выхоўвалі спачуванне, маральную чуласць. Так, у яе ўключаны павучанні пратаірэяў І. Раждзественскага і Р. Пуцяціна. Тэкст просты, зразумелы дзецям, сціслы і звернуты менавіта да дзяцей: «Когда Господь наш Иисус Христос жил на земле, Он очень любил детей за простоту их и незлобие: часто беседовал с ними и даже ставил их в пример

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

взрослым. Любите же, дети, Спасителя нашего, Господа Иисуса Христа, всею силою нежных и добрых сердец ваших; Вспоминайте чаще о Нем, как о вашем благодетеле, и молитесь ему усердно каждый день» [3, с. 6].

У чытанцы, даступнай дзецям, мовай тлумачыцца роля, месца і ўстройства хрысціянскага храма. Пры гэтым І. Кандрацьеў абапіраецца на вершы вядомых рускіх паэтаў, у якіх увасабляецца шэраг рэлігійных таінстваў, дзеянняў вернікаў. Так, І. Кандрацьеў перадае змест малітвы ў час паста вершам А. Пушкіна «Великопостная молитва», тлумачэнне Дабравеста абапіраецца на вершы А. Талстога і І. Аксакава «Благовест» [3, с. 11]. Пачуцці вернікаў у Вялікую суботу перадаюцца вершам В. Жукоўскага «Вечер в субботу». Даступнасць дзецям зместу асноўных псалмоў перадаецца пры дапамозе вершаў А. Мея і М. Языкава [3, с. 18].

Разуменнем ролі хрысціянскіх каштоўнасцей у працэсе духоўна-маральнага выхавання дзяцей можна патлумачыць той факт, што значная частка чытанкі адведзена разгляду важнешых праваслаўных каштоўнасцей. Пры гэтым І. Кандрацьеў не афіцыйнай, казённай мовай распавядае дзецям пра міласэрнасць, рахманасць, спачуванне, пакору, паслухмянасць і іншыя каштоўнасці, а на прыкладзе адпаведных учынкаў асоб, якія жылі ў розныя гістарычныя эпохі. Напрыклад, каб сутнасць міласэрнасці была больш зразумела дзецям, пісьменнік уключыў у кніжку гісторыю пра Філарэта Міласэрнага:

«Напали неприятели на страну, где жил Филарет Милостивый, и ограбили жителей той страны. У Филарета осталось всего имущества – два рабочих вола, одна лошадь и корова с теленком. По доброте своей роздал Филарет неимущим волов и лошадь. Тогда приходит к нему еще один бедный. Филарет не отказал и ему. Отдал ему теленка» [3, с. 26, 27].

У гэтай жа частцы кнігі чытач можа пазнаеміцца з учынкамі св. Яфрэма, ігумена Феадосія, І. Багаслова, вучня св. Ісідара. З любоўю і вялікай павагай Кандрацьеў апавядае дзецям пра дзеянні св. Кірыла і Мефодзія. У нарысе пра стваральнікаў славянскай пісьменнасці ўтрымліваецца шмат гістарычных ведаў. У храналагічным парадку падаецца гісторыя хрышчэння балгар, мараўскіх, чэшскіх славян, палякаў, сербаў, харватаў, хазараў, якіх хрысцілі Кірыл і Мяфодзій. Падрабязна разглядаецца дзейнасць братоў па стварэнні старaславянскай пісьменнасці і перакладу на яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Свяшчэнных пісанняў.

У гэтай частцы кніжкі дзеці знойдуць звесткі аб 12 важнейшых хрысціянскіх святах, іх паходжанні, значэнні і рытуальных дзеяннях падчас кожнага свята. Хрысціянскія пачуцці людзей перадае пісьменнік пры апісанні рытуалаў, якія суправаджалі Божа Нараджэнне, Вадохрышча, Вялікдзень і іншыя хрысціянскія святы. Божае Нараджэнне, тлумачыць дзецям Кандрацьеў, – першае свята ў цыкле каляндарнага года, якое ў традыцыйнай культуры ўсходніх славян звязана з таямніцай зараджэння, вытокаў усеагульнага пачатку. Яно супадала з важнейшай прыродна-касмічнай падзеяй: заканчэнне зімовага сонцастаяння і пlivаротам яго на новы гадавы цыкл. У гэты самы час нарадзіўся Іісус Хрыстос, таму паралельна з Калядамі славяне адзначаюць Божае Нараджэнне: «Иисус Христос, Сын Божий, сошел с неба и воплатился от Пресвятой Девы Марии. Но для чего Иисус Христос, Сын Божий, сошел с неба? Да нас на небеса возвести» [3, с. 36].

Сакральнасць гэтай падзеі вызначыла характар паэтычнай вобразнасці, стылю і мовы гэтай часткі чытанкі. Кандрацьеў надзвычай ярка паказвае пачуцці людзей напярэдадні свята. Дзеці і дарослыя з нецярплівасцю чакаюць гэтай падзеі, іх думкі задоўга да Божага Нараджэння звязаны з сустрэчай свята. Увага дзяцей усё больш канцэнтруецца не на вучобе, а на падрыхтоўцы да свята. Пісьменнік шматфарбна паказвае якімі цікавымі і маляўнічымі рытуальна-абрадавымі дзеяннямі суправаджалася свята.

Такім чынам, жанрава разнастайныя творы першага раздзела чытанкі паказваюць дзецям Бога, блізкага ім і падобнага да чалавека. У тэкстах, якія ўвёў у кніжку Кандрацьеў, дзеці бачаць Бога, Які сышоў на Зямлю, каб падзяліць з імі радасці і пакуты. Бог паўстае не толькі як пакаральнік грэшнага чалавека, а як выратавальнік чалавечай асобы ад маральнага разлажэння, яе духоўнай дэградацыі. Рэлігія ўспрымаецца чытачамі як своеасаблівая і вельмі значная духоўная ніша, якую не здольны запоўніць ніякія іншыя формы. Пісьменнік пераканаўча паказвае, што вера мае на ўвазе не проста перакананне ў існаванне Бога, а і асаблівы духоўна-маральны характар усяго ладу жыцця чалавека: «Желаете ли вы, чтобы и вам на земле было хорошо и весело, чтобы вас осиял свет божественный? Живите между собой в любви и согласии, и вам будет хорошо и весело, и вы будете жить в свете божественном» [3, с. 37].

Цеснай злучанасцю адукацыйнай і выхаваўчай функцый

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вызначаецца «Полный самоучитель русской азбуки в зоологических картинках», які склаў у 1896 г. І. Кандрацьеў [5]. У ім падабраны тэксты, якія садзейнічаюць духоўна-маральнаму выхаванню дзяцей. У лаканічных тэкстах для чытання пісьменнік тлумачыць тры галоўныя хрысціянскія дабрадзейнасці – гэта вера, надзея і любоў. Яны, пераконвае вучняў аўтар, процістаяць сямі грахам. У буквары даюцца кароткія тэксты малітваў, якія чытаюцца перад вучобай, перад прыняццем ежы, пасля яе і інш.

Дыскурс кандрацьеўскіх мастацкіх тэкстаў, дзе даюцца замалёўкі прыроды, паказвае, што прырода ўспрымаецца ім як храм, святыня, вынік Божай волі і мудрасці, уладкаванай ім светабудовы. У мастацкіх творах адчуваецца прынцып «адпаведнасцей», заснаваны на зрокавых, слыхавых, фарбавых, вербальных асацыяцыях, на аналогіях гукаў, пахаў, колераў, вобразаў. Так, у апісанні сядзібы «Вясёлая Ясень» на рацэ Бярэзіна («Божье знамение»), якая належыла графу Рамуальду Валеўскаму, сцвярджае пісьменнік, усё знаходзілася ў гармоніі, якая адпавядала ўстаноўленаму Богам светапарадку. Гэта адпаведнасць парушаецца Напалеонам як суб’ектам супрацьлеглага дэманічнага свету. Пісьменнік паказвае яго антыподам Боскага тварэння: «Человека этого сделала мировым гением грубость, неразборчивость и посредственность, которыми он обладал в более высокой степени, чем грубость, неразборчивость и посредственность» [13, с. 159].

У аповесці пісьменнікам проціпастаўляецца свет уяўленняў свету рэчаў. У раманах замест апісальнай мовы выкарыстоўваецца сугестыўная мова, г. зн. вобразна-сімвалічнае спасціжэнне таемных сутнасцей быцця праз інтуіцыю, унушэнне, паэтычную магію. У «Божьим знамении» такім сімвалам выступае камета, якая з’явілася летам 1811 года, напярэдадні франка-рускай вайны 1812 года. Веруючыя называлі яе Божым знакам і імкнуліся зразумець яе сэнс. Вядома, што сімвалы пазбаўлены празрыстасці, канкрэтнасці, дакладнасці зместу. Ён (змест) з’яўляецца полісемічным, не паддаецца аднаварыянтнай дэшыфроўцы. Выявіць значэнне зместу сімвала дадзена суб’ектам культуры, якія найбольш наблізіліся да пазнання Абсалюту, Вечнасці, трансцэндэнтнай Красы. Такімі персанажамі твора выступае Іраклій Іванчэеў, які надзелены боскім дарам празорца. Ён прадказвае заняцце Масквы французамі, разарэнне шматлікіх краін свету і адначасова драматычны лёс Напалеона. Мюрат, які не валодаў дарам споведзі патлумачыў з’яўленне каметы як знак пераможнага шэсця напалеонаўскага войска: «Появление ее в день рождения вашего величества, не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

случайное. Она путеводная звезда вашего величества» [13, с. 164].

Трансцэдэнтная прысутнасць, вобраза і імя Бога ў апісаннях прыроды, на наш погляд, характарызуе рэлігійна-філасофскі погляд самога Кандрацьева на ўзаемасувязь чалавека і свету.

Даследаванні шэрагу іншых кандрацьеўскіх літаратурных тэкстаў сведчаць, што канцэптуальныя фрагменты рэлігійнага зместу яўна прысутнічаюць у многіх з іх. У яго паэтычных творах сустракаецца шмат рэлігійных зваротаў як у выказванні думак самаго паэта з народу, так і ў выказваннях яго літаратурных герояў. Так, у вершах «Перед казнью» «Жница», «Старо-славянские думки», «Молодка», «Ночная греза», «Жду свидания», «Недоразумение» і іншых творах прысутнічаюць рэлігійныя звароты і думкі: «Кабы раньше на путь Бог наставил, – / Я бы рук-то своих в жизни не окровавил! » [7, с. 83], «Дал мне Бог красу и силушку / Да не знаю, как мне быть!» [7, с. 90], «Ах, девчина, много / Есть всего у Бога» [7, с. 99], «Дивной волей Божию / Та пора пришла» [7, с. 106], «Что?.. Ах, Боже мой!.. Ужели / Непонятно?.. Нынче в ночь» [7, с. 148], «И хороша, как Божий день, / Ты мне мелькнула, как зарница» [7, с. 153], «Ты святыня, Богом данная?» [7, с. 155], «Вы духи мира, смирно тоже! / Не то – всех сохрани вас, Боже!» [7, с. 161]. Аналіз зместу паэтычных і празаічных коласаўскіх твораў гаворыць, што Кандрацьеў заўсёды ў адносінах да сваіх літаратурных герояў зыходзіў з вялікіх гуманістычных ідэалаў, хрысціанскіх запаветаў, любові, міласэрнасці да чалавека.

У багатай творчай спадчыне І. Кандрацьева налічваецца значная колькасць гістарычнай літаратуры, у якой разглядаецца працэс хрысціянізацыі славянскіх земляў, роля і месца праваслаўных храмаў і манастыроў у сацыяльна-палітычным і культурным жыцці ўсходнеславянскіх дзяржаў. Сярод яе можна вылучыць «Историческое описание Киево-Печерской лавры в г. Киеве» [4], «Святыни Валаамского монастыря, места подвижничества преподобных Сергия и Германа, валаамских чудотворцев: история монастыря с древнейших времен по настоящее время» [6], «Икона Божией матери, именуемая «Нечаянная радость», и церковь Благовещения, что на Житном Дворе, в коей икона сия находится» [8], «Московский кремль, святыни и достопамятности: История описания соборов, церквей и монастырей» [12].

І. Кандрацьеў надаваў вялікае значэнне фарміраванню духоўных якасцей асобы па прыкладзе дабранраўнага жыцця праваслаўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

святых. З гэтай мэтай ім складзены біяграфічныя гісторыі шэрагу шырокавядомых у славянскім свеце сваёй святасцю вернікаў. Яго пяру належаць працы: «Преподобный Савва, чудотворец Звенигородский и основанный им Саввин Сторожевский монастырь: историческое описание по документам и преданиям со времени его основания по настоящее время» [9], «Великая раба божия, отроковица Мария, в схиме Марфа. Постриг и схиму приняла от преподобного Серафима, чудотворца Саровского: по документам Серафимо-Дивеевского женского монастыря» [11], «Великое чудо святого Иоанна Кожника» [10] і інш.


1. *Кондратьев, И. К.* «19 февраля» / И. К. Кондратьев // Виленский вестник. – 1869. – № 21. – 22 февр.

2. *Кондратьев, И. К.* «Пречистенская церковь» / И. К. Кондратьев // Вилен. вестник. – 1869. – № 29. – 15 марта.

3. *Кондратьев, И. К.* Искра Божия: книга для начального чтения: в 6 отделах: с олеографическими рисунками / И. К. Кондратьев. – М. : Изд. П. П. Щеглова, 1887.

4. *Кондратьев, И. К.* Историческое описание Киево-Печерской лавры в г. Киеве / И. К. Кондратьев. – М. : Е. А. Губанов, 1892.

5. *Кондратьев, И. К.* Полный самоучитель русской азбуки в зоологических картинах / И. К. Кондратьев. – М. : Типолитогр. И. Е. Ермакова, 1896.

6. *Кондратьев, И. К.* Святыни Валаамского монастыря, места подвижничества преподобных Сергия и Германа, валаамских чудотворцев: история монастыря с древнейших времен по настоящее время / И. К. Кондратьев. – М. : И. А. Морозов, 1896.

7. *Кондратьев, И. К.* Под шум дубрав: Песни. Думы. Былины. Народные сказания / И. К. Кондратьев. – М. : И. А. Морозов, 1897.

8. *Кондратьев, И. К.* Икона Божией матери именуемая «Нечаянная радость» и церковь Благовещения, что на Житном Дворе, в коей икона сия находится / И. К. Кондратьев. – М. : Тип. Вильде, 1899.

9. *Кондратьев, И. К.* Преподобный Савва, чудотворец Звенигородский и основанный им Саввин Сторожевский монастырь: историческое описание по документам и преданиям со времени его основания по настоящее время / И. К. Кондратьев. – М. : И. А. Морозов, 1899.

10. *Кондратьев, И. К.* Великое чудо святого Иоанна Кожника / И.К.Кондратьев. – М. : Тип. Вильде, 1903.

11. *Кондратьев, И. К.* Великая раба божия, отроковица Мария, в схиме Марфа. Постриг и схиму приняла от преподобного Серафима, чудотворца Саровского: по документам Серафимо-Дивеевского женского монастыря / И.К.Кондратьев. – М. : И. А. Морозов, 1906.

12. *Кондратьев, И. К.* Московский кремль, святыни и достопамятности: История описания соборов, церквей и монастырей / И.К.Кондратьев. – М. : И.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Морозов, 1906.
13. *Кондратьев, И. К.* Божье знамение / И. К. Кондратьев. – М. : Мир книги: Литература, 2011.
14. *Чуковский, К.* Люди и книги / К. Чуковский. – М. : Государственноеиздательство художественной литературы, 1958. – 543 с.
РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ